Белыя старонкі Чырвонай кнігі

У НОВЫМ ВЫДАННІ БУДУЦЬ ЗАФІКСАВАНЫЯ ЗМЕНЫ Ў ЖЫВОЙ ПРЫРОДЗЕ ЗА АПОШНІЯ 10 ГАДОЎ.

Пэўныя жывёлы і расліны, якім пагражае знікненне, трапяць у яе ўпершыню. А іншых, наадварот, выключаць з ліку"чырванакніжнікаў" з прычыны дастатковага распаўсюджвання на тэрыторыі Беларусі. Паводле вынікаў даследаванняў спецыялістаў з Нацыянальнай акадэміі навук будуць унесеныя прапановы па канкрэтных відах флоры і фаўны, што маюць патрэбу ў асаблівай увазе і абароне чалавека.

СТРАТЫ І НАБЫТКІ

Узрост Чырвонай кнігі Беларусі адносна малады — тры дзясяткі гадоў. Першы экзэмпляр, які ўключаў 80 відаў жывёл і 85 — раслін, з'явіўся ў 1981-м. Да таго моманту на Захадзе ўжо існавалі падобныя выданні: еўрапейскія эколагі раней за іншых убачылі пагрозу прыродзе з боку тэхнічнага прагрэсу і забілі трывогу. У 1978 годзе выйшла і першая Чырвоная кніга СССР.

Беларускі спіс "чырванакніжнікаў" быў разбіты на 6 катэгорый па ступені пагрозы знікнення відаў. Нулявая катэгорыя, неафіцыйна названая "чорным спісам", аб'яднала жывёл і расліны, якія поўнасцю зніклі з тэрыторыі Беларусі. У яе ўвайшлі, да прыкладу, лясны кот, драфа, хахуля, жамчужніца рачная, з раслін — гладыёлус дзікі, надбароднік бязлісцевы і яшчэ 46 відаў, што не сустракаліся ў Беларусі на працягу апошніх 100 гадоў. Ці страчаныя яны беззваротна? У навукоўцаў на гэты конт няма адназначкага меркавання.

Так, паводле слоў спецыялістаў Мінпрыроды, драфу апошні раз бачылі ў Беларусі ў 30-х гадах мінулага стагоддзя ў Пружанах Брэсцкай вобласці, хахулю — у пачатку XX стагоддзя ў басейне ракі Днепр. Апошнія знаходкі ляснога ката на тэрыторыі краіны датуюцца 30-мі гадамі мінулага стагоддзя. І ўсё ж надзея на тое, што асобныя віды, якія лічацца цяпер зніклымі, захаваліся і яшчэ будуць выяўленыя навукоўцамі, ёсць. У Беларусі нямала таямнічых месцаў, дзе магчымыя самыя нечаканыя знаходкі. Так, Магілеўшчыну, а таксама Жабінкаўскі, Кармянскі і Кастрычніцкі раёны даследчыкі не балавалі сваёй увагай.

Шэрая цапля харчуецца на выспах Тураўскага луга (Гомельская вобласць

У 1993 годзе ўбачыла свет другое выданне Чырвонай кнігі. Спіс ахоўнай флоры і фаўны прыкметна вырас: у яго было ўключана 182 віды жывёл і 214 відаў раслін. Такая тэндэнцыя прадоўжылася і далей: у трэцім, дзейным, выданні Чырвонай кнігі 2003— 2005 гадоў пад аховай значацца 189 відаў жывёл і 274 — раслін.

Пашырэнне спіса "чырванакніжнікаў" не трэба звязваць з пагаршэннем экалагічнай абстаноўкі і ростам нагрузкі на прыроду. Паводле слоў начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага аясроддзя Наталлі Мінчанка, з кожным годам больш маштабнымі становяцца даследаванні жывой прыроды, з'яўляюцца новыя магчымасці для работы навукоўцаў. Вы-нік — шмат інфармацыі пра сган прыроды Беларусі.

Знамянальна, што разам з папаўненнем Чырвонай кнігі відамі жывёл і раслін, якім пагражае знікненне, адбываецца і адваротны працэс — выключэнне з ліку "чырванак-ніжнікаў". Так, напрыклад, ужо не выклікае трывогі лёс белага лебедзя. Больш за тое, "хатняя гусь", як жартаўліва называюць ганарлівага прыгажуна заолагі, нават выжывае да сябе падобных. Месцы, дзе пасяляецца птушка, спешна пакідаюць качкі, якім пасля лебедзя не застаецца харчу.

Яшчэ адзін паказальны прыклад — бабёр. Былі часы, калі ажыятажны попыт на футра і мяса гэтага звярка паставіў яго на грань знікнення ў Еўропе. У пачатку мінулага

стагоддзя бабра можна было ўбачыць толькі на тэрыторыі сучасных Расіі, Беларусі і Польшчы. Ды і тое не часта. Для таго каб захаваць гэты від, у нас у 1925 годзе адмыслова стварылі Бярэзінскі біясферны запаведнік. Сёння баброў у 2—3 разы больш за аптымаль-ную колькасць.

АХОЎНАЯ ГРАМАТА

Значэнне Чырвонай кнігі для флоры і фаўны цяжка пераацаніць. З часу першага яе выдання ў Беларусі значная частка ўключаных у кнігу відаў раслін і жывёл узята пад ахову. Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя штогод выяўляе месцы знаходжання дзікіх жывёл і росту раслін-"чырванакніжнікаў". Затым яны перадаюцца землекарыстальнікам: лясгасам, сельскагаспадарчым прадпрыемствам. Афармляюцца спецыяльныя ахоўныя абавязацельствы, у якіх прапісаны рэжым выкарыстання гэтай тэрыторыі. Як правіла, на ёй абмяжоўваецца гаспадарчая дзейнасць, забараняецца ўсталёўваць намёты і паліць вогнішчы.



Эфект ад такой працы навідавоку. Дзякуючы ёй у Беларусі перастаў быць экзотыкай, да прыкладу, чорны бусел. Гэтая птушка — своеасаблівы біяіндыкатар: яна чуйна рэагуе на змяненні ў комплексе лясных экасістэм. Сёння чорнага нярэдка можна ўбачыць на поўдні краіны па берагах рэк і ручаёў, у дубравах.

Паводле слоў Наталлі Мінчанка, па стане на пачатак гэтага года пад ахову перададзена больш за 4000 месцаў пражывання і росту "чырванакніжнікаў". Амаль кожны раён Беларусі мае свой аазіс, які часам здольны здзівіць нават дасведчаных аматараў флоры і фаўны. Так, мала каму вядома, што на тэрыторыі краіны, слыннай сваімі лясамі і азёрамі, прыжыліся традыцыйныя насельнікі... тундры. На Віцебшчыне і на балотах Мядзельскага раёна ёсць месцы, дзе сустракаецца паўночная ягада марошка і карлікавая бяроза. Не ўсе ведаюць пра тое, што ў нас растуць архідэі, якія не саступаюць па прыгажосці крамным. Усяго на тэрыторыі краікы налічваецца каля 40 відаў сямейства архідных, і вялікая частка іх уключана ў Чырвоную кнігу. Самы буйны від з паэтычнай назвай венерын чаравічак аблюбаваў выспы сярод балот, а таксама дубравы. Унікальнасць гэтай расліны пацвярджае тое, што яна разам з усім сямействам архідэй уключана ў пералік СІТЭС — Канвенцыі па міжнародным гандлі відамі дзікай фаўны і флоры, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення. У апошнія гады вялікія папуляцыі венерынага чаравічка выяўленыя на Брэстчыне. Рэдкую ў Беларусі архідэю — ятрышнік абпалены, што таксама мае статус аб'екта аховы міжкароднага значэння, можна сустрэць у Смалявіцкім раене на тэрыторыі біялагічнага заказніка "Пекалінскі".

Ёсць у Чырвонай кнізе і віды, якія маюць сусветнае значэнне. У Беларусі, напрыклад, гняздуецца да 60 працэнтаў сусветнай папуляцыі вяртлявай чарацянкі. Падтрыманне і аднаўленне папуляцыі гэтай птушачкі, што добра адаптавалася да беларускага клімату, — у інтарэ-сахусёй плакеты.

У РУКАХ ЧАЛАВЕЧЫХ

І ўсё ж, каб некаторыя прадстаўнікі флоры і фаўны не зніклі з твару Зямлі, адных ахоўных мер недастаткова, сцвярджаюць спецыялісты. Часам прырода патрабуе куды большага чалавечага ўмяшання. Наўрад ці Беларусь сёння ганарылася б другой па колькасці папуляцыі зуброў у свеце, калі б не мэтанакіраваная праца па штучным памнажэнні і рассяленні гэтых жывёл.

Апошнія дзікія папуляцыі зубра, паводле слоў начальніка аддзела біялагічнай разнастайнасці Мінпрыроды Аляксандра Гіраева, былі знішчаныя ў 1917-м. "Спатрэбілася каля васьмі-дзесяці гадоў развядзення — спачатку ў заалагічных садах і спецыялізаваных гадавальніках, пазней — у прыродзе, — каб павялічыць колькасць

сусветнага статка з 48 асобін у 1927-м да 4230 у 2009 годзе".

У Беларусі ў 90-я зубры былі толькі ў Белавежскай пушчы, усяго адна папуляцыя. Але за апошнія 15 гадоў іх колькасць вырасла амаль утраят цяпер на тэрыторыі краіны больш за 900 асобін. Шмат у чым гэта вынік спецыяльнам Праграмы па рассяленні, захаванні і выкарыстанні зубра ў Беларусі, якая дзейнічала ў 1994—1998 гадах. Бо для жывёл на тэрыторыі краіны ўжо няма прывычнага месца пражывання — вялікіх лясоў. І без дапамогі чалавека прадстаўнікі адзінага дзікага віду буйных быкоў Еўропы, які захаваўся да нашых дзён, наўрад ці адчувалі б сябе камфортна.

Дарэчы, зубр занесены не толькі ў Чырвоную кнігу Беларусі. Яго таксама ахоўваюць у Літве, Польшчы, Украіне, Расіі.

Каб дапамагчы "чырванакніжнікам" выжыць у нашым урбаністычным свеце, навукоўцы робяць розкыя захады. Некалькі гадоў назад у батанічным садзе Мінска мэтанакіравана вырошчвалі рэдкія расліны. Дзясяткам відаў потым скарысталіся для азеляненння горада. Так на сталічных вуліцах з'явіліся насельнікі дзікай прыроды: гваздзік картузіянскі, астранцыя, касач сібірскі і іншыя. І воку прыемна, і прыродзе карысць...

АБНОЎЛЕНЫЯ СПІСЫ

Да выхаду ў свет новага выдання Чырвонай кнігі застаецца яшчэ два гады. Пра ўсе змяненні, якія яго закрануць, гаварыць яшчэ рана — даследаванні прадаўжаюцца. Але некаторыя нюансы ўжо вядомыя. У новую Чырвоную кнігу, напрыклад, уключаць еўрапейскую норку. Паводле ацэнхі навукоўцаў, на тэрыторыі Беларусі засталося ўсяго каля дзясятка асобін гэтага віду. Паранейшаму будуць пад аховай мядзведзь, рысь, вяртлявая чарацянка, венерын чаравічак, труфель і іншыя расліны і жывёліны, якім пагражае знікненне.

Нядаўна беларускія заолагі прапанавалі змяніць статус асобных відаў, а батанікі занеслі больш за 10 новых відаў для ўключэння ў чацвёртае выданне Чырвонай кнігі. Частка з іх — ахоўныя ў Еўропе і ўпершынш выяўленыя ў Беларусі. Ці будуць яны вядомыя нашым нашчадкам? Зразумела, прырода — жывы арганізм, ён развіваецца, чуйна рэагуе на гаспадарчую дзейнасцьчалавека, змянсннсэкалогіі, навышэнне антрапагеннай нагрузкі. Паводле прагнозаў навукоўцаў, у бліжэйшыя дзесяцігоддзі на Зямлі могуць беззваротна знікнуць да 70 відаў раслін. Але чалавек можа многае зрабіць, каб пазбегнуць такіх страт.

Лілія Холадава

Источник: Беларусь.-2011.-№5.-С.33-35.